Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды над удзельнікамі мірных акцый і сустрэч працягваюцца дапоўнена

25.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Дар'я Юрчанка, фота "Віцебскай Вясны"

У Беларусі працягваюцца суды над удзельнікамі сустрэч з блогерам Сяргеем Ціханоўскім і акцый па "кармленні галубоў".

25 траўня ў судзе Чыгуначнага раёну **Віцебску** суддзя **Юрый Урбан** разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні да віцяблянкі **Дар'і Юрчанка**. Дзяўчыну прызналі вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (ч.1 арт. 23.34 КаАП) і аштрафавалі на **25 базавых велічыняў,** паведамляе "Віцебская Вясна".

Гэта ўжо другі штраф, які жыхарка Віцебску атрымала цягам месяца. 18 траўня Дар'ю аштрафавалі на 540 рублёў за кармленьне галубоў (суддзя Алена Цыганкова).

Згодна з адміністрацыйным пратаколам, Юрчанка 30 красавіка ў загадзя вызначаным месцы ля будынку «Марка-сіці» парушыла заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Яна нібыта актыўна ўдзельнічала ў несанкцыянаваным пікетаваньні, выказвала свае грамадска-палітычныя погляды ў інтэрв'ю блогеру Сяргею Ціханоўскаму. У далейшым відэаматэрыял быў разьмешчаны на ютуб-канале **«Страна для жизни».**

Сваёй віны ў судзе дзяўчына не прызнала і ад усялякіх тлумачэньняў наконт выстаўленага абвінавачваньня і сваіх дзеяньняў падчас сустрэчы з Ціханоўскім адмовілася.

> *“25 базавых – гэта вялікая сума для нашай сям’і. Адразу і не заплаціш. Я ня ведаю, дзе грошы на ежу ўзяць, хаця кожны дзень працую, а тут яшчэ штрафы аплочваць. Але ж ёсць артыкул Канстытуцыі, які дае людзям права на свабоду слова і забяспечвае свабоду сходаў*”, – сказала пасля суду Дар’я Юрчанка.

Нагадаем, што ў Віцебску ў пятніцу 22 траўня быў затрыманы актывіст **Аляксей Прохараў.** Яго запрасілі ў аддзел аховы правапарадку Чыгуначнага раёну для дачы тлумачэнняў пра ягоны ўдзел у кармленні галубоў 3 траўня. Але з міліцыі яго не выпусцілі – затрымалі і адразу адвезлі ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ). Актывіст паспеў паведаміць праваабаронцу, што суд над ім адбудзецца ў панядзелак.

У выніку Аляксей Прохараў атрымаў **10 сутак арышту**. Судзілі актывіста праз Skype.



Палітычны пераслед у траўні: прамежкавыя вынікі і расклад новых судоў

Як мінімум да першага чэрвеня будуць працягвацца суды над паплечнікамі Сяргея Ціханоўскага і іншымі актывістамі.

Таксама праваабаронцам стала вядома, што **ў Мінску** яшчэ на мінулым тыдні 20 траўня актывіст "Народнай грамады" **Сяргей Спарыш** быў асуджаны на **8 сутак арышту**. Яго, як і яшчэ 7 чалавек, затрымалі ў мінулы аўторак у Вярхоўным судзе, дзе праходзіла абскарджванне нерэгістрацыі "кандыдатаў пратэсту". Таксама стала вядома, што затрыманы тады ж **Дзмітрый Місюк** атрымаў **15 базавых велічынь (405 рублёў)** штрафу за "непадпарадкаванне міліцыі" (арт. 23.4 КаАП).



У Мінску судзяць затрыманых "кандыдатаў пратэсту" і іх паплечнікаў

Сёння ў Мінску праходзяць суды над затрыманымі напярэдадні незарэгістраванымі "кандыдатамі пратэсту" і іх паплечнікамі. На 20 траўня "Вясна" валодае звесткамі пра 8 затрыманых.

У **Маладзечне** па артыкуле 23.34 КаАП на **30 базавых велічынь (810 рублёў)** асуджаны **Дзмітрый Булкоўскі** за ўдзел у мясцовай акцыі па "кармленні галубоў".

У **Наваполацку** за ўдзел у сустрэчы з Сяргеем Ціханоўскім 29 красавіка **8 базавых велічынь (216 рублёў)** штрафу атрымаў **Артур Сіні**. Таксама ў Наваполацкім раённым судзе на **6 базавых** аштрафавалі жанчыну, якая прыходзіла на тую сустрэчу літаральна на хвіліну. Яе прозвішча высвятляецца.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

